канцэпцыях, патрабуюць сур'ёзных, разважлівых адносін, а не паспешлівага праходжання скопам. Возьмем, напрыклад, даволі багатую савецкую дзіцячую літаратуру. Яе ідэалагізацыя, з аднаго боку, і гуманізм - з другога, высокай якасці творы пісьменнікаў і творы "на заказ", супярэчлівасць меркаванняў - усё гэта праблемы, якія неабходна глыбока пераасэнсоўваць. Варта адказацца і ад прынятай аднамернай перыядызацыі, па-новаму паглядзець на сацыялагічныя арыенціры, у прамой залежнасці ад якіх знаходзіліся ўсе астатнія параметры гісторыі савецкай дзіцячай літаратуры. Правільныя акцэнты ў адборы, аналізе і падачы матэрыялу - важнейшая задача выкладання.

Улічваючы тое, што курс "Сусветная дзіцячая літаратура" шматслойны, у яго ўваходзяць літаратуры розных краін, варта адмовіцца ад традыцыйнай гісторыка-храналагічнай пабудовы курса. Мэтазгодна выкладаць матэрыял пэўнымі блокамі (якім будзе адпавядаць форма кантролю), разглядаючы шляхі развіцця канкрэтных жанраў (напрыклад, развіццё жанру казкі ў беларускай, рускай, скандынаўскай дзіцячай літаратуры альбо пэўных праблем, напрыклад, гуманістычны ідэал у сучаснай беларускай і амерыканскай дзіцячай літаратуры), акцэнтуючы ўвагу студэнтаў менавіта на тых творах, якія таго заслугоўваюць.

Апісаны падыход, безумоўна, больш складаны, ён патрабуе шырокага ахопу ведаў, аналітычнай работы, разумення літаратурнага працэсу. Можна пайсці і шляхам сумяшчэння гісторыка-храналагічнага падыходу з праблемна-тэматычным, але галоўнае, каб з поля зроку не выпала тое лепшае, што ёсць у дзіцячай літаратуры народаў свету.

Няхай М.В.,
канд.філал.навук,
дацэнт

## РОЛЯ БЕЛАРУСКАГА ГІСТАРЫЧНАГА РАМАНА Ў ПРАЦЭСЕ ВЫКЛАДАННЯ ЛІТАРАТУРЫ

Зараз часта заходзіць гутарка аб слабай жыццяздольнасці беларускага гістарычнага рамана, аб адсутнасці ўстойлівых нацыянальных традыцый у яго развіцці. Сапраўды, у дарэвалюцыйны час, у даваенныя гады ў нас уласна гістарычнага рамана не было, хоць спробы ствараць яго назіраліся ў М.Гарэцкага, З.Бядулі, М.Зарэцкага, К.Чорнага, Я.Коласа. Але толькі пад пяром У.Караткевіча гэты жанр атрымаў статус прызнанага і паўнацэннага ("Каласы пад сярпом тваім", "Хрыстос прызямліўся ў Гародні", "Чорны замак Альшанскі"). У.Караткевіч лічыцца заснавальнікам уласна гістарычнага рамана ў беларускай літаратуры, бацькам гістарычнай прозы.

У нас дасюль няма аўтабіяграфічнага рамана, што сведчыць аб нізкай увазе да нацыянальна-гістарычнай тэматыкі. Доўгі час не знаходзіў шырокага распаўсюджвання ў беларускай літаратуры ў сувязі з афіцыйнымі забаронамі гісторыка-біяграфічны раман, ён узнік толькі нядаўна (А.Лойка, В.Коўтун, Я.Радкевіч).

З сярэдзіны 50-х гадоў інтэнсіўнае развіццё атрымаў раман на заходнебеларускую тэму (Я.Брыль, П.Пестрак, М.Машара, Г.Марчук, В.Каваленка, В.Адамчык, Г.Далідовіч). У нас склалася група так званых гісторыка-рэвалюцыйных раманаў, форму якіх пісьменнікі вымушаны былі актыўна выкарыстоўваць, бо гэта давала адзіную магчымасць хоць што-небудзь сказаць аб гісторыі роднай Беларусі ў 20-80-я гады.

Прыкметна разнастаіцца тэматыка і расце мастацкая культура ўласна гістарычнага рамана на сучасным этапе (Л.Дайнека, Э.Скобелеў, К.Тарасаў, Э.Ялугін, В.Чаропка, У.Арлоў, В.Іпатава, В.Вячорка, Т.Бондар , А.Кажадуб, П.Ламан і інш.). Паказ народнага жыцця з вялікімі экскурсамі ў гісторыю існаваў заўсёды і асабліва развіўся ў апошнія гады ва ўсіх відах рамана аб сучаснасці.

Таму ў працэсе вывучэння і даследавання творчасці раманістаў нельга абыходзіць гістарычны раман. Абысці яго ўвагай - значыла б занядбаць рэальным становішчам, не бачыць, як гэтая разнавіднасць жанру становіцца мастацкай рэальнасцю. Яна ж мае сваю і эстэтычную, і сацыяльную радаводную. У сцвярджэнні, што беларускі гістарычны раман нельга вывучаць з-за яго слабасці, тоіцца ранейшае перабольшванне іерархічнага падыходу да найбольш складаных момантаў літаратурнай эвалюцыі. Мы пераконваемся, што і цяпер існуе ў наяўнасці ідэалагічная, кан'юктурная дамінанта не толькі ў афіцыйным літаратуразнаўстве, але і ў навуковым мысленні філалагічных школ, якія яму супрацьстаяць. Менавіта гэта ў канчатковым

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выніку прыводзіць да таго, што па меры аслаблення ідэалагічнага ціску замест марксісцка-ленінскай канцэпцыі, якая скажала рэальны малюнак існавання літаратуры ў савецкі час, пачынае выстройвацца новая канцэпцыя, якая па старому прынцыпу выцясняе з літаратуры любую з'яву, калі яна не знаходзіць лёгкага вытлумачэння як "прыватны" ці "нехарактэрны" выпадак.

Цяпер патрэбны больш настойлівыя спробы даследаваць гістарычны раман як цэласную сістэму. У гэтым выпадку могуць выявіцца асабліва выразна як яго станоўчыя якасці, так і недахопы. Зараз мае вялікае практычнае значэнне распрацоўка прынцыпаў сістэмнага даследавання паэтыкі, так як яна дазваляе літаратуразнаўцам і крытыкам авалодаць метадамі, якія дапамогуць глыбей раскрыць якасную сутнасць мастацкіх з'яў. Асэнсаванне сутнасці гістарычнага рамана ў маштабе літаратурнага працэсу, прымяненне гэтага маштабу на практыцы дазваляе даваць яго інтэрпрэтацыю ў такім ключы, калі становіцца ясна, што мы маем справу з катэгорыяй якаснай. Несумненна актуальным уяўляецца даследаванне гістарычнага рамана як сістэмы і перш за ўсе з боку жанрава-стылёвай разнастайнасці. Цэласнасць літаратурнага твора дасягаецца здольнасцю пісьменніка да ўсеагульнай гарманізацыі мастацкага арганізма як узаемаўзгодненых яго "тэхнічных" кампанентаў. Паняцці, якімі характарызуецца цэласнасць літаратурнага твора, могуць і павінны расцэньвацца як важнейшыя крытэрыі яго мастацкасці. Настаў час распрацоўкі сістэмных даследаванняў індывідуальнай паэтыкі і нават паэтыкі асобнага твора, іх сістэмаўтваральных фактараў. Асабліва неабходна весці аналіз некалькіх, усіх раманаў, якія маюць сутнасныя і фармальныя прыкметы, больш ярка дэманструюць разнастайнасць палітры пісьменнікаў, ілюструюць працэс авалодання паўнацэннай формай рамана, выяўляюць унутраную рухаючую сілу, узаемасувязі і дыялектычныя супярэчнасці, узятыя ў гісторыка-літаратурнай перспектыве. Развіццё сістэмных уяўленняў аб асобным мастацкім творы, аб жанры актывізуе пошукі новых метадычных прыёмаў, якія павышаюць эфектыўнасць, навуковую дакладнасць літаратуразнаўства. Асабліва істотным выступае вывад, які пацвярджае, што, нягледзячы на недастатковую неразвітасць гісторыка-рэвалюцыйнага рамана (ён, дарэчы, таксама не склаўся ў моцны самастойны напрамак), выкідаць яго з рахунку немэтазгодна. Памылкі ў ацэнцы некаторых бакоў рэвалюцыйных будняў, падзей грамадзянскай вайны, наяўнасць элементаў лакіроўкі і хрэстаматыйнага глянцу ў адлюстраванні савецкай рэчаіснасці наступных гадоў, павярхоўнасць у раскрыцці дзейнасці партыі па будаўніцтву сацыялізму, нават палітычная аднабаковасць, кан'юнктурнасць, наіўнасць, а часамі і антыгуманнасць, і варожасць працоўнаму чалавеку поглядаў, невысокае майстэрства некаторых раманістаў гісторыка-рэвалюцыйнай тэмы – усё гэта не павінна прывесці да ігнаравання творчасці пісьменнікаў, якія агульнымі намаганнямі стварылі з'яву, што застаецца ў літаратурным свеце і патрабуе сур'ёзнага вывучэння.

Вельмі складанай справай з'яўляюцца класіфікацыя гістарычнага рамана па тыпах на аснове ўсіх разнастайных навейшых поглядаў на сучасны раман, суадносіны прынцыпаў тэорыі і традыцый. Менавіта гэтым абумоўлена сур'ёзнасць выказванняў В.Каваленкі, М.Тычыны, В.Жураўлёва, П.Дзюбайлы, Н.Пашкевіча, А.Адамовіча, М.Мушынскага, А.Яскевіча, А.Пятковіча на гэтую тэму. Але цяпер існуе нескладаная праблема ўлічваць апошнія дасягненні літаратуразнаўчай навукі. Трэба звярнуць увагу на тыя новыя падыходы, якія фарміруюцца сёння дапасавальна да літаратурнай спадчыны і твораў, што з'яўляюцца цяпер у друку. Патрэбна не забывацца і аб тым, што прымяненне сістэмнага аналізу, падыходу да канкрэтнага матэрыялу разнастаіць накіраванасць школьнай і вышэйшай адукацыі, дапамагае стварэнню больш дакладнай гісторыі літаратуры і методыкі яе выкладання. Роля беларускай гістарычнай прозы ў павышэнні ўзроўню і актывізацыі прыярытэтных напрамкаў падрыхтоўкі кадраў культуры па нацыянальных праграмах ва ўмовах пераходу да шматузроўневай сістэмы адукацыі няспынна ўзрастае. Прыцягненне твораў на гістарычную тэму да выкладання значна павысіць прафесіяналізм выкладчыкаў літаратуры універсітэта. Таму шырокае выкарыстанне гэтага матэрыялу ў вучэбных праграмах - аж да ўвядзення спецкурса па гісторыі беларускага рамана наогул і гістарычнага ў прыватнасці - з'яўляецца справай наспеўшай і неабходнай і павінна быць эфектыўнай.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ